УДК 392.51(476.2-37Брагін)

Т. В. Пімінѐнкава

Навук. кір. – В. С. Новак, д-р філал. навук, прафесар

ВЯСЕЛЛЕ НА БРАГІНШЧЫНЕ: АДМЕТНЫЯ РЫСЫ

У артыкуле на аўтэнтычным фальклорна-этнаграфічным матэрыяле архіва навукова-вучэбнай фальклорнай лабараторыі пры кафедры рускай і сусветнай літаратуры Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны» разгледжаны асаблівасці вясельнай абраднасці Брагінскага раѐна Гомельскай вобласці, паказаны каларытныя мясцовыя звычаі. Выяўлены адметныя рысы, характэрныя для асобных вясельных абрадавых этапаў, звернута ўвага на звязаныя з імі прыкметы і павер�So'і.

Вяселле – выключная з‟ява ў жыцці кожнага чалавека. Ні адно свята не суправаджаецца такой вялікай колькасцю абрадаў, звычаяў і песень. Нашы продкі з вялікай адказнасцю ставіліся да выканання ўсіх рытуалаў, звязаных з вяселлем. Прыемна адзначыць, што і сѐння ў XXI ст., моладзь імкнецца захоўваць абрады і звычаі мінулых пакаленняў, з высокай пашанай адносячыся да іх. Шматлікія фальклорна-этнаграфічныя зборнікі, прысвечаныя народнай духоўнай спадчыне беларусаў, пераконваюць, што, сапраўды, для фальклору кожнай мясцовасці Беларусі характэрны свае адметныя рысы. Брагінскі раѐн Гомельскай вобласці – яркі прыклад самабытнай вясельнай абраднасці, струкуру якой складаюць тры часткі: перадвясельная, уласна вясельная і паслявясельная. Прыгадаем, што перадвясельны цыкл ахопліваў такія абрадавыя этапы, як пярэпыты, сватанне запоіны, заручыны. Як засведчыла азнаямленне з этнаграфічнымі апісаннямі па вясельнай абраднасці, іншы раз можна назіраць аб‟яднанне двух этапаў у межах якога-небудзь аднаго. Асабліва гэта даволі часта датычыць сватання і заручын. Звычайна жыхары Брагіншчыны падбіралі час для вяселля ў адпаведнасці са святамі народнага календара. Лічылася, што нельга гуляць Фольклористика и этнография 294 вяселле ў перыяд Піліпаўкі або ў перадвелікодны пост: «Вяселле гулялі, як Піліпаўка канчаецца, а Храшчэнне 19 января. Вот вада ахрэшчыцца і после таго гулялі свадьбу. Гулялі пакуль начынаецца Вялікадні пост, а ў пост ужо не гулялі і ў Піліпаўку не гулялі. Калі Паска атойдзе, ужо можна апяць гуляць да самай Троіцы» (запісана ў в. Крыўча ад Агароднік Зоі Мікалаеўны, 1949 г. н.). З фактычнага матэрыялу вынікае, што сватанне – адзін з пачатковых этапаў вясельнага абрадавага комплексу. Менавіта з гэтага абраду пачынаецца падрыхтоўка да вяселля. Звычайна ў сваты хадзілі па 3-5 чалавек. У большасці выпадкаў гэта былі хросны бацька, бацька, дзядзька жаніха: «У сваты хадзілі, малады ўжо хроснага бярэ, дзядзьку, калі е, і ідуць ужэ ў сваты» (запісана ў в. Аляксееўка ад Ціханчук Любові Мікалаеўны, 1936 г. н.). Сватанне заўсѐды суправаджалася жартамі, смехам людзей. Гэта сапраўднае свята вѐскі: «Прышлі сватацца і шуцілі так: – Паведамілі, што ў вас ѐ цѐлка, прадаецца цѐлка? Мы прыйшлі купляць! – А вось і наша цѐлка. Выводзяць дзяўчыну, патом ужэ пасядуць за стол, пашуцяць, пасмяюцца, высватае сабе ўжэ тую дзевачку, пагуляюць, пагамоняць і пайшлі» (запісана ў в. Міхнаўка ад Жураў Алены Рыгораўны, 1972 г. н.). З боку нявесты рыхтавалі ручнікі, якімі і перавязвалі сватоў: «Рушнікі дарылі сватам. Яны прыдуць, а мама бягом бярэ рушнікі і перавязвае іх. Сама вышывала ўсягда, каб красівыя былі» (запісана ў в. Аляксееўка ад Рудабелец Таццяны Васільеўны, 1957 г. н.). Заручыны – адна з галоўных частак перадвясельнага цыклу. У в. Аляксееўка Брагінскага раѐна заручыны святкавалі ўвечары. Збіраліся хлопцы і дзяўчаты. Сяброўкі маладой вышывалі на маленькіх хустачках кветачкі. Нявеста, калі вышыла маладому кветачку, насыпае ў тую хустачку зярняты і прадае сябрам жаніха. Хустачка з зярнятамі сімвалізуе згоду маладой уступіць у шлюб: «Заручыны спраўлялі ўвечары. Малады браў два-тры чалавекі дружкі, а дзеўкі ад сваей бралі па тры дзеўкі ды кветкі ўшывалі тым ужо хлопцам, за тое, што малады бярэ. Маладая кветачку ўшывае на грудзь і на платочак добры, а тады ў еты ўжо платочак зернят насыпае ды заўвязуе. Тады дае еты ўжо платочак маладому, а яго дружок грошы ўжо дае, так як купляе ўжо тыя семечкі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

для маладога. Семечкі ето ужэ як саглассе маладой» (запісана ў в. Аляксееўка ад Ціханчук Любові Мікалаеўны, 1936 г. н.). Першым этапам уласна вясельнай часткі лічылася гатаванне каравая, з якога і пачыналася ўласна вяселле. Вясельны каравай 295 займаў надзвычай важнае месца ў традыцыйным вясельным абрадзе беларусаў. Шматлікія дзеянні, звязаныя з падрыхтоўкай каравая, выконваліся святочна, урачыста, паколькі лічылася, што гэты атрыбут вяселля – сімвал блаславлення маладых, пажадання ім дабрабыту. Гатаваць каравай маглі не ўсе жанчыны, а толькі замужнія, рабілася гэта для таго, каб у шлюбе маладыя ніколі не сварыліся, вялі добрую гаспадарку і паважалі адзін аднаго: «Каравай выпякалі замужнія. Ета штоб маладыя ў браке харашо жылі, не ссорыліся, у каторых сям�above"я харошая, штоб хазяйства глядзелі» (запісана ў в. Міхнаўка ад Жураў Алены Рыгораўны, 1972 г. н.). У сістэме вясельнай абраднасці асаблівае месца займаў «збор нявесты». Лічылася дрэннай прыкметай знаходжанне маладой у хаце, дзе былі нейкія здарэнні, бо гэта магло адбіцца на лёсе маладых: «Нядьзя, штоб нявеста сабіралася ў хаце, дзе былі якія-небудзь сабыція: пажар які ці яшэ што. Усягда дзеўку адпраўлялі на зборы к каму-небудзь другому, бо ета ж сварыцца будуць, крычаць, да і жызні не будзе ім» (запісана ў в. Аляксееўка ад Рудабелец Таццяны Васільеўны, 1957 г. н). Асаблівай увагі заслугоўвае вясельны ўбор нявесты. Галоўным атрыбутам быў вянок, які старанна рыхтавалі напярэдадні вяселля: «Вянок – глаўнае, што надзявала нявеста. Яго раней жанчыны рабілі з цвяточкаў, з розачкаў» (запісана ў в. Крыўча ад Агароднік Зоі Мікалаеўны, 1949 г. н.). Варта адзначыць, што адрозніваецца «збор і прыгатаванне дзяўчынсірот». Падчас падрыхтоўкі нявесты да шлюбу, дружкі, калі расплятаці косы маладой, то прыгаворвалі: Баба будзе плакаць, У меня ўсе браты і дзеткі У маткі памерлі. Браточкі-сакалочкі, Прышчапіце сарочкі. Брат сястры косы расплятаў, Дзе ж ты браток уплёты падзяваў (запісана ў в. Крыўча ад Агароднік Зоі Мікалаеўны, 1949 г. н.). Калі ўсё было падрыхтавана да правядзення вяселля, пачынаўся ўрачысты момант святкавання самога шлюбу. Вяселле на Брагіншчыне гулялі звычайна некалькі дзён: «Свадзьба тры дні длілася. Первы – у нявесты, втары – у жаніха, на трэці – ужо Фольклористика и этнография 296 ў родзічаў розных» (запісана ў в. (аг.) Чамярысы ад Краўчанка Наталлі Міхайлаўны, 1938 г. н.). Першы дзень звычайна пачынаўся з выкупу маладога. Гэты звычай нагадваў тэатралізаваную пастаноўку, сутнасць якой заключалася ў тым, што малады падыходзіў да хаты, дзе яго сустракалі сяброўкі маладой, а тыя імітавалі нежаданне аддаваць нявесту, патрабавалі выкуп: «Утрам прыязжаў жаніх. Ён хацеў забраць нявесту, а яна хавалася ад яго. Яе дружкі не выдавалі яе, а прасілі грошы, гарэлку, канфеты. Як добра заплаціць, дак выводзілі маладую, а не, дак баб старых прыводзілі ці мужыкоў пераадзетых» (запісана ў в. Аляксееўка ад Рудабелец Таццяны Васільеўны, 1957 г. н.). Кульмінацыйным момантам на вяселлі была дзяльба каравая. Абавязковай умовай было тое, што жанчына, якая дзяліла каравай, павінна быць шчаслівай у шлюбе: «Каравай дзялілі на вяселле. Брал і жанчыну адну, штоб не я была і яна несла гэты каравай к сталу і казала: «Каравай пёкся, бралася з сямі палей пшаніца, з сямі палей вадзіца, з сямі кароў малако, масла і яшчэ яіц паўтараста». Каравай выносілі і ставілі на стол, а тады ўжо хросны бацька гаварыў перад тым, як разразаць каравай: «Ацец і маць, благаслявіце каравай разразаць» (запісана г. п. Камарын ад Гаўрыленка Марыі Іванаўны, 1937 г. н.). Як дэманструюць уласныя запісы звестак, паслявясельная частка Брагінскага раёна называлася «куры», якая мела такую назву менавіта па той прычыне, што на другі дзень пасля вяселля збіраліся сваякі і «гатавалі курэй»: «Другі дзень – «куры». Вот прыходзяць, у куратніку самі, скольки змогуць славіць, а тады панясуць іх на свадзьбу, круцяць, пажараць і абедаюць» (запісана ў в. Крыўча ад Агароднік Зоі Мікалаеўны, 1949 г. н.). Убранне нявесты на другі дзень было не прынцыповым. Адметным было тое, што нельга было насіць вянок: «На другі дзень нявеста была без вянка ці пахваты. Адзявала, што панравіцца. Як завівалі косы на куце, так завязвалі платок. Завязвала платок хросная, якая завівала валасы» (запісана ў в. Буркі ад Шкурко Ганны Адамаўны, 1926 г. н.). Такім чынам, варта адзначыць, што вясельная абраднасць Брагіншчыны насычана адметным мясцовым каларытам. Духоўная напоўненасць кожнага абраду дадае комплексу цэласнасць і ўзнёсласць. Веданне вясельнага абрадавага комплексу Брагіншчыны значна пашырае народную спадчыну нашай краіны.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ